# СТАРОЕ ЖЫЛЛЁ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў...

**У аўторак у цэнтры ўвагі членаў прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў быў Указ № 357, які датычыцца жылля, што стаіць пустое і не выкарыстоўваецца.**

Не лішнім будзе нагадаць, што работу з праблемным жыллём распачалі яшчэ ў лютым 2006-га. Згодна з Указам № 70, патрабавалася скарацiць колькасць непатрэбнага. І сельскія выканкамы Віцебшчыны пасля карпатлівага вывучэння налічылі больш за 25 тысяч такіх дамоў. Менавіта тады была праведзена значная работа, каб адшукаць спадчыннікаў. І тысячы даўно ўжо гарадскіх жыхароў, і нямала замежнікаў «раптам» успомнілі пра свой кавалак зямлі. Пачалі думаць, што з ім рабіць. А ў лютым 2012-га працягам нарматыўнай базы стаў Указ № 100.

Тэма актуальная і дагэтуль. Насельніцтва не толькі на Віцебшчыне ўсё больш становіцца гарадскім: людзей у вёсцы, на жаль, усё меней. Адпаведна, «метры» ў глыбінцы нярэдка застаюцца незапатрабаванымі, без гаспадароў і прэтэндэнтаў на выкарыстанне.

Дарэчы, на мерапрыемстве была агучана цікавая статыстыка, якая датычыцца не толькі самай паўночнай вобласці, але і краіны ў цэлым. Калі ў 1991-м у вёсках і пасёлках жылі 3,3 мільёна чалавек, цяпер толькі каля двух мільёнаў...

Пытанне абмяркоўвалася не па прынцыпе пратакольнага мерапрыемства са справаздачамі — апошняе ператварылася ў дыскусію. Усе прапановы, заўвагі, спрэчныя пытанні сталі нагодай для выпрацоўкі адзіных стратэгій, падыходаў, алгарытмаў дзеяння, падкрэсліў **кіраўнік «парламента Прыдзвінскага краю» Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Ён нагадаў, што сёлета завяршаецца трохгоддзе малой радзімы. Таму трэба актывізавацца, каб у кожнага дома ў сельскай мясцовасці быў прыстойны выгляд. Калі няма гаспадароў, іх нашчадкаў, трэба прапанаваць жыллё іншым, напрыклад, пад дачы, сельскі бізнес, фермерам, каб разводзілі жывёлу, птушку. Калі з часам дом разбураецца, яго трэба зруйнаваць. Усё проста і лагічна. А на месцы былых «метраў», калі іх знесці, можна распачаць апрацоўку зямлі, штосьці пабудаваць «з нуля»...

Што да колькасці выяўленага безгаспадарнага жылля на Віцебшчыне на сённяшні дзень, то такіх дамоў каля 2,1 тысячы.

Няма агульных падыходаў, канстатаваў Уладзімір Цярэнцьеў. І ў выніку адчуваецца незразумелы дысананс. У прыватнасці, чаму ў Аршанскім раёне выявілі пад дзвесце непатрэбных дамоў, а ў суседнім Дубровенскім — толькі адзін?

Паводле інфармацыі **начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігара ЛЕВЯНКОВА,** з пачатку рэалізацыі ўказа па зносе старых і пустуючых дамоў, а гэта каля пятнаццаці гадоў таму, іх стала менш на амаль што 17 тысяч. Агульная плошча зямельных участкаў набліжалася да 2,5 тысячы гектараў.

**Начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Сяргей МЯЛЕШКІН** катэгарычны ў размове пра тых старшынь сельскіх Саветаў, якія не разумеюць важнасці своечасовага ўліку, зносу безгаспадарных аб'ектаў. Такіх ён патрабуе пазбаўляць займаемай пасады. Прывёў прыклады. У прыватнасці, кіраўніку мясцовай прадстаўнічай улады тры разы тлумачылі, што трэба зрабіць, а ніякіх спроб рэалізаваць тое не было. І што з такім «адказным» рабіць? Няўжо не разумее, што дом без гаспадара — гэта месца, дзе могуць траўміравацца ў тым ліку і дзеці, якія вырашылі там пагуляць...

А летась пры тушэнні пажару на такім аб'екце ў Пастаўскім раёне загінуў выратавальнік. Без бацькі засталіся двое дзяцей...

На завяршэнні пасяджэння прэзідыума старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў падкрэсліў, што яно стане пачаткам больш плённай працы. Самыя цікавыя даклады ўвойдуць у брашуру, якая без перабольшвання стане настольнай для выканаўцаў, дапаможа ўлічыць усе нюансы.

Дарэчы, у Гарадоцкім раёне, як паведаміла Святлана Зуева, старшыня райсавета, такую «шпаргалку» для адказных асоб ужо распрацавалі. Цяпер «вераснёўскія тэзісы» стануць асновай для публікацыі больш грунтоўнага даследавання на дадзеную тэму.

На сайтах органаў мясцовай улады вырашана рэкламаваць такое жыллё для продажу з фота, усёй неабходнай інфармацыяй і юрыдычнымі нюансамі. Запланавана арганізаваць экскурсію для дэпутатаў у раёны Беларусі, дзе найбольш удала пастаўлена работа з безгаспадарным жыллём.

«МС» будзе і далей адсочваць, як рэалізуецца заканадаўства ў дачыненні да навядзення парадку на зямлі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЛЕКІ ВЫКІДАЕМ АСОБНА

## У сталіцы з'явяцца новыя падыходы да ўтылізацыі адходаў

**У Мінску з красавіка 2021 года будзе ўкаранёны раздзельны збор лекаў, таблетак, пілюль, розных медыцынскіх прэпаратаў, у якіх скончыўся тэрмін выкарыстання.**

Такое рашэнне прынялі сталічныя дэпутаты на 20-й сесіі Мінскага гарадскога Савета. Паводле слоў яго старшыні Андрэя Бугрова, дэпутаты аднагалосна ўхвалілі праект пастановы «Аб абыходжанні з адходамі пратэрмінаваных лекавых сродкаў».

Прыняццю гэтага рашэння папярэднічала працяглая і сур'ёзная работа. Дэпутаты імкнуліся ўсебакова даследаваць згаданае пытанне, бо яго пэўная незвычайнасць насцярожвала: як правільна арганізаваць працэс? Збіраць металалом, макулатуру, бутэлькі з пластыку і шкла, аўтамабільныя акумулятары — справа звыклая. А вось лекі... Тут трэба было ўзважыць усе плюсы і мінусы.

А пытанне наспела. Дэпутатам Мінгарсавета было ведама, што ўтылізацыя пратэрмінаваных лекавых сродкаў разам са звычайнымі бытавымі адходамі ўяўляе схаваную пагрозу для здароўя мінчан. Такія лекі ў глебе, у пластах грунтовых вод могуць выклікаць таксічныя рэакцыі, якія потым нагадаюць аб сабе будучым пакаленням нечаканымі хваробамі.

Выказаць сваё меркаванне па гэтай праблеме на сесію дэпутаты запрасілі начальніка ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Уладзіміра Лебедзя. Той расказаў аб мяркуемых захадах.

У прыватнасці, плануецца распачаць збор лекавых сродкаў у аптэках, паліклініках, бальніцах, амбулаторыях і ў іншых установах, дзе мінчане атрымліваюць медыцынскія паслугі, праходзяць курсы лячэння. У спецыяльныя кантэйнеры іх пацыенты, наведвальнікі змогуць у якасці адходаў складзіраваць непатрэбныя ўжо лекі і медпрэпараты.

Дэпутатамі пастаўлена задача адпаведным службам Мінгарвыканкама выпрацаваць дакладны алгарытм дзеянняў па ўтылізацыі такіх небяспечных адходаў, арганізаваць каардынацыю работ, а таксама вызначыць адказных асоб за збор, выдаленне і абясшкоджванне пратэрмінаваных лекаў на тэрыторыі сталіцы.

Як паведаміў Андрэй Бугроў, на 20-й сесіі Мінскага гарадскога Савета быў прыняты яшчэ шэраг важных рашэнняў. Дэпутаты далі згоду на павелічэнне агульнага аб'ёму інвестыцыйнай праграмы на 21 мільён рублёў. Грошы пойдуць на завяршэнне будаўніцтва важных сацыяльных аб'ектаў: могілак «Лясная» і пад'язной дарогі да іх, працягу ўзвядзення адной мінскай вуліцы.

Дэпутаты Мінгарсавета ўнеслі і змены ў бюджэт сталіцы. Яго сродкі пераразмеркавалі ў межах удакладненага гадавога аб'ёму выдаткаў.

У выніку будзе дадаткова накіравана 96,9 мільёна рублёў на ахову здароўя. Напрыклад, 2,2 мільёна пойдуць на аплату транспартных паслуг для перавозкі пацыентаў, хворых на каранавірус. Больш як 10 мільёнаў выдаткавана на аплату лекавых сродкаў і перавязачных матэрыялаў на льготных умовах ці ўвогуле бясплатна для асобных катэгорый грамадзян і г. д.

**Леанід ТУГАРЫН.**

РОБІМ РАЗАМ

# І НАВАТ З АЎТАМАБІЛЕМ

## Яшчэ некалькі двароў Краснаполля сталі ўтульныя дзякуючы ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання з уладай

**Нядаўна тут на дзіцячых пляцоўках у раёне шматпавярховай забудовы па вуліцах Курака і Ленінскай з'явіліся новыя гульнявыя комплексы і абсталяванне. Жыхары зрабілі гэту прыгажосць з дапамогай камунальнікаў і пры фінансавай падтрымцы Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

Скарыстацца такой дапамогай ім падказала **старшыня раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН**. Падчас прыёму грамадзян да яе звярнуліся маладыя маці — прадстаўніцы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з просьбай дапамагчы ў абнаўленні гульнявога абсталявання для дзяцей. Частка яго прыйшла ў непрыдатнасць, а тое, што яшчэ можна эксплуатаваць, карыстаецца такім попытам, што дзецям гэтага не хапае. Нават на арэлі збіраецца чарга.

Старшыня райсавета прапанавала вырашыць пытанне сумеснымі намаганнямі: каб атрымаць грашовую дапамогу, жыхары таксама павінны ўнесці пасільны ўклад у справу. Жанчыны пагадзіліся і данеслі гэту інфармацыю да жыхароў. Грамадскую ініцыятыву, дарэчы, падтрымалі і сама Анжаліка Гоман як дэпутат па Ленінскай выбарчай акрузе № 10, і дэпутат райсавета па Ленінскай выбарчай акрузе № 11 Людміла Палавая. Усяго жыхары сабралі 640 рублёў, унёсак жа Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў склаў 1634 рублі.

Ініцыятыўныя мамы разам з камунальнікамі падабралі неабходнае абсталяванне, якое «Жылкамгас» уставіў бясплатна. Дзеці былі на сёмым небе ад радасці і адвялі душу па поўнай праграме. Нават дзятва з суседніх двароў прыбегла, каб ацаніць набытак. Па просьбе жыхароў камунальнікі зрабілі новае вечка для пясочніцы і замянілі пясок. А заадно падрамантавалі гульнявыя аб'екты і зрабілі дадатковую лаўку. Па ініцыятыве старшыні райвыканкама Аляксандра Трушкіна майстры «Жылкамгаса» сабралі з дрэва і падручных матэрыялаў дзіцячы аўтамабіль.



Асабліва задаволеныя зменамі маладыя маці. Раней ім з маленькімі дзецьмі, якім крыху больш чым год, даводзілася хадзіць у парк, а гэта не зусім зручна. Зараз усё побач. І яны ўдзячны ўсім, хто прыклаў да гэтага свае намаганні. Ініцыятары так натхніліся вынікамі, што вырашылі і далей удасканальваць сваю дваровую тэрыторыю, каб яна стала яшчэ больш прыгожай і прыстасаванай для адпачынку. Дэпутаты абяцаюць іх у гэтым падтрымаць.



**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Краснапольскага райсавета дэпутатаў.**